# Гісторыя Поразава




Поразава вядома з 15 ст. як велікакняжацкае ўладанне ў ВКЛ. У 1460 г. на сродкі Яна Ягінтавіча Рынвіда тут быў пабудаваны касцёл Святых Пятра і Паўла.

У пачатку 15 ст. мястэчка, з 1507 г. цэнтр Поразаўскай воласці Ваўкавыскага павета Навагрудскага ваяводства.

У 1500 г. вялікі князь літоўскі Аляксандр выдаў прывілей на палац "Рымавідаўскі" у Поразава Андрэю Аляксандравічу Дрождчу.

У 1518 г. прывілей на пажыццёвае трыманне двара Ваўкавыскага з воласцямі Ваўкавыскай, Поразаўскай і Навадворскай атрымаў Ю.Глябовіч.

Пры праўленні вялікага князя літоўскага Аляксандра (1492-1506), Поразава атрымала магдэбурскае права, аднак ні дакладная дата, ні дакладны тэкст фундацыйнага прывілея невядомы. Вядома, што мяшкане Поразава пры Аляксандры атрымалі магдэбурскае права, 1 торг у тыдзень і кірмаш, навакольныя землі.

Паколькі першы поразаўскі войт Давыд Турчын у 1504 г. атрымаў пацвярджэнне свайго права на войтаўства, то можна меркаваць, што магдэбурскае права і разам з ім войтаўства было ўсталявана ў 1503 г.

З наданнем магдэбурскага права Поразава вылучалася з ранейшай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай сістэмы і ўтварала асобную адзінку са сваёй сістэмай улады. Згодна з магдэбурскім правам паселішча набывала статус горада, адміністрацыйную самастойнасць са сваімі атрыбутамі – грамадзянствам, інстытутамі ўлады і судом, гербам, падаткавай сістэмай. У Поразава адразу склалася пэўная структура штогадовых "гарадскіх урадаў", прадстаўленая войтам, ландвойтам, бурмістрам, 3 радцамі, 3 лаўнікамі і пісарам. Бурмістр, радцы, лаўнікі складалі гарадскі орган кіравання – магістрат.

Войт узначальваў гарадское самакіраванне і прадстаўляў горад перад дзяржаўнымі органамі ўлады. Акрамя гэтага, ён стаяў на чале суда лаўнікаў, які разглядаў крымінальныя справы, прэтэнзіі мяшчан да феадалаў і іх падданых. Ландвойт замяшчаў яго пры неабходнасці. Лаўнікі або прысяжныя з'яўляліся членамі лавы, разглядалі крымінальныя справы. Акрамя гэтага, яны ажыццяўлялі і ўвод ва ўладанне нерухомасцю і інш. Рада, у якую ўваходзілі бурмістр і радцы, ажыццяўляла функцыі гарадской улады і суда па маёмасных і грамадзянскіх справах. Бурмістр старшынстваваў на пасяджэнні рады і наогул усяго магістрата. Даныя XVIII ст. сведчаць, што ў Поразава быў супольным суд рады і лавы.

Існавала некалькі схем змены войтаў у Поразава. Звычайна войт займаў сваю пасаду пажыццёва. Пасля смерці ранейшага войта новага прызначаў вялікі князь літоўскі (да 1569 г.), кароль польскі і вялікі князь літоўскі ў 1569-1795 гг.

Поразаўскае войтаўства мела статут дзецічнага, якое пераходзіла па спадчыне. Тым не менш манарх зацвярджаў дадзеныя пераходы.

Разам з тым гарадскі войт меў права перадаць войтаўства іншай асобе: дадзены спосаб змены войта патрабаваў выканання пэўных прававых нормаў. Так, пры жаданні перадаць войтаўства, войт павінен быў атрымаць дазвол у манарха, затым прызнаць асабіста або дакументальна дадзеную "перадачу" у судзе, пасля чаго прэтэндэнт на войтаўства павінен з'явіцца ў Поразава і прынесці прысягу на вернасць гораду і на належнае выкананне функцый войта. Без такой прысягі прэтэндэнт на войтаўства не станавіўся войтам, нават калі ў яго быў адпаведны прывілей.

11 сакавіка 1507 г. вялікі князь літоўскі Жыгімонт Стары пацвердзіў асобным прывілеем поразаўскае войтаўства Яну Падаляніну, які ажаніўся на жонцы Давіда Турчына пасля яго смерці. У якасці войта Падалянін прыгадваецца яшчэ ў актах 1524 г.

Прывілеі на магдэбурскае права для Поразава пацвярджаліся некалькі разоў. У 1518 г. гэта зрабіў вялікі князь літоўскі Жыгімонт Стары. У яго грамаце пацвярджалася магдэбурскае права, надаваліся таргі ў сераду, кірмашы на дні Святога Пятра і Паўла, Усіх Святых і Дабравешчанне Дзевы Марыі, права прапінацыі з капчынай у 60 літоўскіх грошаў. Гэты прывілей быў прызнаны несапраўдным, бо поразаўскія мяшчане заявілі, што яны "войта о тое право, которое он (войт) от господаря его милости принёс, не посылали, ани его есмо просили, абы он такое право нам выправил: бо он все ку пожитку собе выправил, а нам на великую шкоду". У сувязі з гэтым вялікі князь загадаў прывілей "содрати" і "оставил мещан Порозовских при старом праве (старого привилея славное памети Александра короля его милости".

27 сакавіка 1523 г. ад Жыгімонта Старога Поразава атрымала прывілей, у якім яму пацвярджалася магдэбурскае права, вызваленне ад правоў і звычаяў "літоўскіх і іншых, якія яму перашкаджалі", ад улады дзяржаўных ураднікаў. У дакуменце падкрэслівалася, што па магдэбурскім праве адказваць мяшчане маглі толькі перад войтам, а ён перад манархам. Прывілеем давалася магчымасць правядзення ў Поразава трох кірмашоў на дні Святой Тройцы, Усіх Святых і Дабравешчання Дзевы Марыі і таргоў па серадах.

3 ліпеня 1523 г. Жыгімонт І накіраваў ліст да ваўкавыскага дзяржаўца Мацея Вайцаховіча, засведчыўшы Поразаву магдэбурскае права, памернае і тарговае паводле прывілея свайго брата Аляксандра.

15 чэрвеня 1616 г. прывілей 1518 г. пацвердзіў кароль польскі, вялікі князь літоўскі Жыгімонт Ваза. Горад таксама атрымаў кірмашы на дні Святых Пятра і Паўла, Усіх Сятых і Дабравешчання Марыі Панны, таргі па серадах. Лістом ад 15 чэрвеня 1616 г. ён жа пацвердзіў Поразаву рэвізорскі ліст скарбовага двараніна Яна Горскага ад 4 снежня 1615 г., у якім той пацвярджае ўставу рэвізора Андрэя Клігоўскага. Апошняй вызначаны памеры падаткаў з поразаўскіх мяшчан: чынш (42 грошы з валокі), капшчына (па капе грошаў ад мядовых і піўных корчмаў), паўкапы (ад гарэлачных корчмаў).

У чэрвені 1616 г. Поразава атрымала герб, які ўяўляў сабой барочны шчыт. У блакітным полі шчыта на залатым паўмесяцы выява Маці Божай з дзіцём Ісусам на руках.



20 чэрвеня 1633 г. кароль польскі, вялікі князь літоўскі Уладзіслаў Ваза пацвердзіў Поразаву прывілей 1616 г. Ніякіх змен ці дадаткаў у прывілеі не рабілася.

6 жніўня 1659 г. кароль польскі, вялікі князь літоўскі Ян Казімір Ваза пацвердзіў (канфірмаваў) прывілей свайго брата Уладзіслава.

Далей прывілеі Поразава пацвярджалі каралі польскія, вялікія князі літоўскія Міхаіл Вішнявецкі, Ян Сабескі – 20 студзеня 1679 г., Аўгуст II – 28 лістапада 1718 г., Аўгуст III – 14 лістапада 1744 г. У дадзеныя прывілеі пацвярджэнні папярэдніх прывілей перапісваліся даслоўна, ніякіх дапаўненняў да ранейшых не рабілася.

Апошні канфірмацыйны прывілей Поразаву быў выдадзены каралём польскім, вялікім князем літоўскім Станіславам Аўгустам Панятоўскім 9 мая 1774 г. За пацвярджэннем звярталіся бурмістр, райцы, войт і лаўнікі Поразава.

22 лістапада 1718 г. вялікі князь літоўскі і кароль польскі Аўгуст II Моцны надаў Поразаву "заручны ліст", у якім навакольная шляхта папярэджвалася ад наездаў і рабункаў Поразава пад пагрозай штрафа ў 10 000 грошаў літоўскіх і крымінальнай адказнасці адпаведна са Статутам ВКЛ 1588 г.

У фондах Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея знойдзены сургучны адбітак пячаткі органаў гарадскога самакіравання Поразава. На пячатцы – выява Маці Божай з дзіцём на руках. Па колу пячаткі надпіс: +PIECZENC MIASTA POROZOWA ONNO 1720 (+ПЯЧАТКА МЕСТА ПОРАЗАВА ГОДУ 1720).

У 1767 г. Поразава значна пацярпела ад пажару, у час якога згарэў і касцёл (пазней адноўлены графам В.Тышкевічам).

Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай, у 1795 г., Поразава ўвайшло ў склад Расійскай імперыі Ваўкавыскага павета Слонімскай губерніі.



У 1825-1828 гг. на ахвяры вернікаў і пры вялікіх выдатках Яснавяльможнага Пана Ксаверыя Завішы з цэглы і бутавага каменя ксяндзом Міхалам Грабавецкім пабудаваны касцёл Святога Міхаіла Архангела. Прамавугольны будынак накрыты двухсхільным дахам з вальмай над алтарнай часткай і трохвугольным франтонам на фасадзе, завершанымі сігнатуркамі. На фоне паліхромнай бутавай муроўкі сцен вылучаны атынкаваныя і пабеленыя плоскія ліштвы прамавугольных аконных праёмаў, прасценачныя пілястры, трыгліфны фрыз з карнізам на дэнтулах, шырокі антаблемент. Унутры – зала перакрытая плоскай драўлянай столлю. Уздоўж заходняй сцяны – балкон хораў. Хоры з арганам трымаюцца на чатырох калонах.

Спрошчаная архітэктура інтэр’ера ўпрыгожана рознымі алтарамі, амбонам, паліхромнай драўлянай скульптурай 18 ст. Падлога ўслана квадратнай абпаленай кафляй. У надбрамнай званіцы – звон з сюжэтнай гравіроўкай, адліты ў 1749 г.

У 1833 г. у Поразава было 102 дамы, 482 жыхары, царква, касцёл, 6 крам. У 1847 г. у Поразава адкрылася народнае вучылішча.

З 1861 г. Поразава – цэнтр воласці.

19 мая 1868 г. у Поразава ўзнік пажар. Як рапартаваў Гродзенскаму губернатару ваўкавыскі павятовы спраўнік, у час пажару згарэла жылых дамоў з гаспадарчымі пабудовамі: сялянскіх – 77, яўрэйскіх – 90, дом валасной управы, дом святара, праваслаўная драўляная царква, драўляны матэрыял на пабудову новай царквы, яўрэйская сінагога, 7 маленькіх дамоў, лазня, дзве кузні і 19 крам. Страты склалі 100 тысяч рублёў срэбрам.

У 1870 г. у Поразава налічвалася 136 двароў, пражывала 658 жыхароў.



У 1872 г. з цэглы ўзведзена Тройцкая царква. Чатырохстворчатая аб’ёмна-прасторавая кампазіцыя складаецца з 8-граннай званіцы над кубападобным прытворам, кароткай трапезнай, папярочнай прамавугольнай малітоўнай залы, 5-граннай апсіды з бакавымі рызніцамі. Двухсхільны дах асноўнага аб’ёму завершаны па цэнтры цыбулепадобным купалам на 8-гранным барабане, па ўскрайках – макаўкамі. Макаўкамі таксама завершаны вальмавы дах апсіды і шацёр званіцы. Тры ўваходы ў прытворы вырашаны калоннымі арачнымі парталамі, арачныя аконныя праёмы дэкарыраваны рустам.

У 1886 г. у Поразава было 129 двароў, 1468 жыхароў. Тут размяшчалася валаснае ўпраўленне, праваслаўная царква, касцёл, капліца, сінагога, 2 багадзельні, яўрэйская школа, 22 крамы, піваварня, ганчарнае і 2 гарбарныя прадпрыемствы. Праводзіліся 4 штогадовыя кірмашы.



У канцы 19 – пачатку 20 ст. непадалёку ад Поразава, у маёнтку Багудзенкі, якім валодалі прадстаўнікі роду Бутаўт-Анджэйковічаў, быў узведзены драўляны прамавугольны сядзібны дом, накрыты высокім ламаным дахам. Невялікія алькежы-вежачкі ў тарцах будынка ўвенчаны востраканечнымі шатрамі з фігурнымі шпілямі. У ніжніх паверхах алькежаў – уваходы ў дом, а на верхніх – утульныя пакоі з балкончыкамі. На фоне асноўнага аб’ёму сядзібнага дома

вылучаецца шацёр цэнтральнага гранёнага мансардавага рызаліта. Над галоўным уваходам, які аформлены чатырохкалонным ганкам, змяшчаецца тэраса з парапетам. Цэнтральную частку дома займала анфілада парадных залаў, якую пазней змяніла калідорная планіроўка. Найбольш адметна выглядаюць пакоі з боку парку.



Яны маюць гранёныя выступы, сцены якіх амаль поўнасцю складаюцца з вокнаў. Багата і разнастайна выкарыстана ў афармленні дома разьба па дрэве. Фасады аздабляюць балясіны, розныя валюты, фігурныя ліштвы аконных праёмаў. Побач з домам быў закладзены парк рэгулярнай планіроўкі з сістэмай узаемна перпендыкулярных алей.



У 1845 г. маёнтак Багудзенкі належыў І.А.Калянкевічу, меў 432 дзесяціны зямлі, 10 цяглых двароў, 73 жыхары, уключаў фальварак Багудзенкі і вёску Кусянцы.

У 19 – пач. 20 ст. Поразава з’яўлялася адным з вядомых цэнтраў ганчарнага промыслу. Тут выраблялся чорнаглянцавы посуд, вырабы буйных памераў з суцэльна глянцавым пакрыццём, з выціснутым хвалістым ці зубчатым узорам. Калекцыя такога посуду экспанавалася на саматужніцка-прамысловай выстаўцы ў Вільні ў 1913 г.

Паводле перапісу 1897 г. у Поразава было 592 двары, пражывала 1979 жыхароў, 2 праваслаўныя царквы, касцёл, сінагога, яўрэйскі малітоўны дом, народнае вучылішча, збожжазапасны магазін, вадзяны млын, гарбарня, медаварнае прадпрыемства, завод па вырабу газіраванай вады, 33 гандлёвыя крамы, 6 піцейных дамоў. Праводзілася 7 кірмашоў: 9 мая, 13 чэрвеня, 15 жніўня, 8 верасня, 1 кастрычніка,1 лістапада, 6 снежня.

У 1905 г. у Поразава налічвалася 2430 жыхароў, дзейнічалі: фельчарскі пункт, аптэка, паштовае адзяленне, народнае вучылішча (у 1891 г. заняткі наведвалі 50, у 1905 г. – 90 хлопчыкаў). У вучылішчы працавалі выпускнікі Свіслацкай настаўніцкай семінарыі В.Біканович і А.Марчык.

З восені 1915 г. Поразава было акупіравана германскімі войскамі.

З 01.01.1919 г. Поразава ў складзе БССР, з лютага 1919 г. – у Літоўска-Беларускай ССР, з красавіка 1919 г. акупіравана польскімі войскамі.

З сакавіка 1921 г. Поразава ў складзе Ваўкавыскага павета Беластоцкага ваяводства Польшчы, цэнтр гміны.

У верасні 1921 г. у Поразава налічвалася 319 дамоў, 1793 жыхары.

З лістапада 1939 г. Поразава ў складзе БССР, з 4 снежня 1939 г. – у Брэсцкай вобласці. З 15 студзеня 1940 г. Поразава – цэнтр Поразаўскага раёна, з 12 кастрычніка – цэнтр Поразаўскага сельсавета.

Поразаўскі раён займаў плошчу 744,19 кв. км, уключаў 684 населеныя пункты з 5654 дварамі, 29912 жыхарамі.

З 12.10.1940 г. у Поразаўскі раён уваходзіла 11 сельсаветаў: Дашкавіцкі, Кукліцкі, Лаўрынавіцкі, Лескаўскі, Міхайлаўскі, Навадворскі, Нізянскі, Падароскі, Поразаўскі, Хрустаўскі, Шурыцкі. У Поразава і раёне дзейнічалі 3 вінакурні, 4 смалярні, 6 цагельных прадпрыемстваў, 14 млынаў, крухмальнае прадпрыемства.

У 1940 г. у Поразава было 443 дамы, 2467 жыхароў, працавалі: 2 паравыя млыны, кравецкая, шавецкая і сталярная арцелі, каўбасная майстэрня, 2 пякарні, ганчарная вытворчасць з чорнай гліны. Тут дзейнічалі: 2 няпоўныя сярэднія школы, бальніца на 45 ложкаў, амбулаторыя, аптэка, дзіцячы сад, раённае аддзяленне сувязі, Дом сацыялістычнай культуры, ветэрынарная лячэбніца.

22 чэрвеня 1941 г. фашысцкая Германія вераломна напала на Савецкі Саюз, пачалася Вялікая Айчынная вайна.

З першых дзён вайны тэрыторыя Поразаўскага краю стала арэнай кровапралітных баёў. Савецкія салдаты мужна абаранялі сваю зямлю, але націск ворага стрымаць не ўдавалася. Воінскія часці з кровапралітнымі баямі вымушаны былі прабівацца з акружэння.

Праз Поразава ў накірунку на Зэльву з рэшткамі тэхнікі рухалася 31-ая танкавая дывізія. Сюды ж адыходзілі і кавалерысты. У выключна цяжкім становішчы аказаўся 13-ы механізаваны корпус, які да пачатку вайны не быў поўнасцю ўкамплектаваны. Прыняўшы няроўны бой з фашыстамі недалёка ад дзяржаўнай граніцы, пад бесперапыннымі бамбёжкамі і артылерыйскім агнём, корпус быў вымушаны адступаць. Камандаваў войскамі 13-га механізаванага корпуса і кіраваў абаронай на лініі Свіслач – Поразава – Новы Двор генерал-маёр Пётр Мікалаевіч Ахлюсцін, кавалер ордэна Чырвонага Сцяга і двух ордэнаў Чырвонай зоркі. Сілы ворага ў некалькі разоў перавышалі сілы корпуса. Аднак, чырвонаармейцы на ўчастку Свіслач – Поразава пабудавалі абарончыя ўмацаванні і падрыхтаваліся да абароны.

25 чэрвеня на світанні гітлераўскія войскі пачалі бязлітасна бамбіць занятыя 13-ым механізаваным корпусам рубяжы. Вецер яшчэ не паспеў разагнаць дым ад разрываў бомб, як фашысты пайшлі ў атаку. У абаронцаў участка Свіслач – Поразава засталося ў страі ўсяго 10 лёгкіх танкаў. Сканцэнтраваць іх у адным месцы было немагчыма. Фашысты наступалі на ўсіх участках. Узначальваў танкавую часць капітан Шведаў. Па яго прапанове вырашылі дзейнічаць танкамі з засады. Па наступаючых фашыстах ударылі гарматы і батарэі старшага лейтэнанта Краева. Іх агнём былі падбіты дзве варожыя бронемашыны, а танк, які прарваўся

цераз лінію абароны, звязкай гранат знішчыў намеснік палітрука Васюцін. Сустрэўшы такі адпор, праціўнік адступіў. Прыкладна праз 3-4 гадзіны, атрымаўшы падмацаванне, вораг зноў пайшоў у наступленне. Разгарэўся гарачы бой. Мужнасць і бясстрашнасць савецкіх воінаў вымушаны былі прызнаць і самі гітлераўцы. Так, былы начальнік штаба 4-ай нямецкай арміі, якая наступала ў гэтай паласе фронту, генерал Блюментрых заявіў: “Пачатковая бітва ў чэрвені 1941 г. паказала нам Чырвоную армію. Нашы страты даходзілі да 50 %…Тут мы даведаліся, што значыць змагацца па рускаму спосабу”.

Ужо на трэці дзень вайны ў Поразава ўвайшлі гітлераўскія войскі. Афіцэры паважна прагульваліся, аглядалі прыгожыя мясціны.

**З успамінаў В.Раманцэвіча:** “…На світанні стракатанне конікаў і пяшчотныя спевы салаўёў былі перапынены кулямётнымі чэргамі, узрывамі гранат, цоканнем капытаў коней. З боку Навадворскага бальшака ў Поразава ўварваліся чырвоныя кавалерысты.

Гучнае “ура” некалькі разоў ускалыхнула цішыню чэрвеньскай вуліцы. Салдаты фюрэра кідаліся ў розныя бакі і падалі, прымаючы смерць ад шабляў і куль. Паўгадзіны цягнулася крывавая бойка. Дзесяткі гітлераўцаў знайшлі сабе магілу ў гэтым месцы, якое здавалася ім такім ціхім. Але сілы былі няроўнымі. Атрад смельчакоў адступіў, пакінуўшы на месцы бою каля дзесятка забітых коней… Калі небяспека мінула, нямецкае камандаванне пачало наводзіць “парадак”.

Дарослых вяскоўцаў эсэсаўцы прымусілі прыбраць забітых коней і сапсаваную тэхніку. Забітых салдат і афіцэраў фашысты хавалі самі. У поўдзень, калі палявая жандармерыя правяла мерапрыемствы па бяспецы, на месца бітвы прыбылі старшыя нямецкія афіцэры. За імі пазней на “мерседэсе” з узмоцненай аховай прыехаў вялікі воінскі чын. Меркавалі, што ён павінен быў зрабіць выніковае заключэнне наконт мінулай бітвы. Абмахваючыся, ён выйшаў агледзець мясцовасць, некалькі разоў абышоў плошчу і штохвілінна даваў нейкія распараджэнні падначаленым, якія крочылі за ім з раскрытымі планшэтамі і рабілі занатоўкі на тыпаграфічных картах.

На рагу плошчы гітлеравец спыніўся. Цяжка сказаць, чым больш зацікавіўся вайсковец: самой трыбунай ці тым, што каля яе яшчэ ляжалі забітыя коні? Афіцэр параўняўся з трыбунай. Секунда… Усё здарылася імгненна! З укрыцця з’явіўся чырвонаармеец, узмахнуў клінком – і яшчэ адзін вораг быў забіты.

Пачаўся страшэнны перапалох. Гітлераўцы хаатычна стралялі, але смельчаку, здаецца, удалося схавацца. Медыцынская дапамога, якая прыбыла, ужо не спатрэбілася фашысцкаму афіцэру. Забіты аказаўся палкоўнікам гітлераўскай арміі, камандаваў вялікай эсэсаўскай часцю, быў асабіста ўзнагароджаны фюрэрам жалезным крыжам”.

З прыходам нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Поразава адразу ўсталяваўся акупацыйны рэжым. Згодна “Інструкцыі пра асобныя вобласці” да дырэктывы № 21 плана “Барбароса” па кіраўніцтве эканомікай у акупіраваных усходніх абласцях нямецкім камандаваннем намечаны практычныя мерапрыемствы: масавы тэрор, рабаванні, гвалтаванне і забойствы ўводзіліся ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

Сэнс такой палітыкі – не дапусціць супраціўлення народа, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва.

Новая ўлада ў Поразава ўсталявалася ў кароткі тэрмін. Аднавілася ранейшае адміністрацыйнае дзяленне, пачалі дзейнічаць гміны. Праз месяц гміна перайменавана ў камісарыят. Жыхарам пасля наступлення цемнаты забаранялася знаходзіцца на вуліцы. На работу ў Германію адбіралася здаровая моладзь.

У хуткім часе ў Поразава створана яўрэйскае гета, якое было адразу агароджана. Яно ахоплівала тэрыторыю паміж цяперашнімі вуліцамі Я.Коласа, Лясной, Спартыўнай, Леніна. Пабудаваны кантрольна-прапускны пункт, дзе дзяжурылі паліцэйскія ці жандармы. Для таго, каб выйсці з гета, трэба было мець спецыяльны пропуск, наяўнасць якога не гарантавала права на жыццё за яго сцянамі. Яўрэяў, якія не мелі пропуска, за межамі гета расстрэльвалі. Перыядычна праводзіліся аблавы з мэтай выяўлення людзей з іншых гета. Іх таксама расстрэльвалі. Да лістапада 1942 г. – часу ліквідацыі поразаўскага гета – многія яўрэі рабілі адчайныя спробы знайсці сховішча па-за яго межамі.

Ліквідацыі гета папярэднічаў расстрэл двух дзесяткаў старых яўрэяў у Дзямідаўках (2 км ад Поразава). У іх ліку былі дзве маладыя дзяўчыны з Беластока. Астатніх яўрэяў пасадзілі на павозкі і разам з невялікімі пажыткамі вывезлі ў Ваўкавыск.

Поразава, як і ўсю Белавежскую пушчу, фашысты ўключылі ў асаблівую акругу, якой кіравала ўсходне-пруская адміністрацыя. У 1941-1942 гг. у ваколіцах пушчы эсэсаўцы спалілі дзесяткі населеных пунктаў, іх жыхароў перасялілі ў Поразава і Хрышчонавічы (непадалёку ад Поразава). Лясы Белавежскай пушчы былі напоўнены варожымі войскамі. Тут знаходзілася 28 гарнізонаў, былі пабудаваны склады боепрыпасаў. У Поразава размясціўся нямецкі гарнізон.

З першых дзён вайны пачалося масавае супраціўленне фашыстам. Тут, у тыле ворага, засталіся адрэзаныя наступленнем фашыстаў салдаты і афіцэры Чырвонай арміі, партыйныя і савецкія работнікі. Яны сталі арганізатарамі падпольных і партызанскіх груп. Да іх далучалася мясцовае насельніцтва. Была налажена сувязь паміж актывістамі, былымі членамі КПЗБ (усяго 37 чалавек). У хуткім часе быў створаны антыфашысцкі камітэт. Члены групы збіралі зброю, налажвалі сувязь з дзеючымі ў тыле ворага салдатамі і афіцэрамі Чырвонай арміі. Ішла жорсткая барацьба з фашыстамі.

На тэрыторыі Поразаўскага раёна дзейнічалі: брыгада імя Чапаева, імя К.Каліноўскага (уваходзіла ў Беластоцкае злучэнне – камандзір брыгады М.К.Вайцяхоўскі, камісар Я.Г.Осіпаў, начальнік штаба С.В.Чудзінаў), брыгада “Савецкая Беларусь” (камандзір брыгады М.У.Бабкоў, начальнік штаба Р.К.Дарафееў). Асабліва актыўна дзейнічаў у Поразаўскім краі атрад імя А.В.Суворава гэтай брыгады, камандзірам якога быў А.Л. Лявонцьеў.

1 верасня 1943 г. пачаў дзейнічаць Поразаўскі падпольны райком камсамола (ЛКСМБ). Яго асноўная база знаходзілася ў партызанскай брыгадзе “Савецкая Беларусь” (камандзір М.У.Бабкоў, камісар П.І.Масалаў) у Поразаўскім раёне. У склад падпольнага райкома ЛКСМБ уваходзілі: сакратары (Шымановіч Андрэй Фёдаравіч з 01.09.1943 г. па 12.03.1944 г., загінуў; Аксёнаў Іван Ягоравіч з 01.09.1943 г. па 15.07.1944 г.); члены райкома (Шабат Аляксей Сцяпанавіч з

15.10.1943 г. па 15.07.1944 г., Янушка Сцяпан Іванавіч з 09.05 1944 г. 15.07.1944 г., Брыль Іван Міхайлавіч з 09.05.1944 г. 15.07.1944 г.).



*Поразава.1943 год.*

14 жніўня 1943 г. Атрад імя Суворава (200 чалавек, 22 куляметы, 17 аўтаматаў) уступіў у бой каля Войтавага Моста з групай салдат і паліцыі ў складзе 300 чалавек. Немцы адыходзілі, пакідаючы забітых і параненых.

15 жніўня 1943 г. Атрад гітлераўцаў у складзе 700 чалавек атакаваў атрад імя Суворава. З-за значнай колькаснай перавагі ворага атрад адышоў у балоцісты раён пушчы.

6 кастрычніка 1943 г. у Поразаўскі раён была перапраўлена спецгрупа НКДБ БССР "Стойкія". Дзейнасць яе распрастранялася на Свіслацкі і Ваўкавыскі раёны.

**З дакладной запіскі партызанскай брыгады імя В.І. Чапаева аб ратаванні партызанамі мірнага насельніцтва:** "1 ноября 1943 г., ранним утром, в расположение бригады им. Чапаева прибыл крестьянин (д. Собольки Порозовского района) Илья и доложил комбригу т.Матевосяну и секретарю РК КП(б)Б т.Шламанову о том, что немцы окружили деревню и открыли по населению стрельбу. Население спасается бегством в лес, многие малые дети, старики и старухи остались в деревне. Илья передал просьбу односельчан спасти их от гибели.

Камбриг Матевосян немедленно выслал 16 конных автоматчиков и 130 партизан с пулеметами и автоматами. Для руководства операцией выехал сам. На опушке леса, около деревни, испуганные и плачущие люди с радостью и криками встретили партизанскую поддержку. Партизаны начали окружать деревню. Немцы поспешно ушли…

По всей округе разнеслась молва, что партизаны не дали людей в обиду врагу".

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 29. Спр. 33. Л.7.*

**З дакладной запіскі сакратара Беластоцкага падпольнага абкома КП(б)Б В.Я. Самуціна аб становішчы ў вобласці:** 1 студзеня 1944 г.

"После оккупации Белостоцкой области немцами вся территория области включена в состав Восточной Пруссии. Установленная граница проходит примерно (с севера на юг) между Гродненским и Василишковским районами,

захватывая часть Барановичской области, между Скидельским, Волковысским районами Белостоцкой области возле реки Зельвянка, захватывая часть Щучинского района Барановичской области и Порозовского района Брестской области.

На установленной границе организована охрана из немецких солдат".

У наваколлі Поразава, у Белавежскай пушчы, змагаўся з ворагам атрад імя Жукава брыгады імя Чапаева. У брыгаду ўваходзіла 436 партызан. Камандзірам яе быў Хачык Агаджанавіч Мацевасян, камісарам – Аляксандр Гаўрылавіч Шламанаў. Партызаны вялі баі па разгрому гарнізонаў фашыстаў.

Кровапралітныя баі вяла брыгада імя Чапаева с 29 по 31 мая 1944 года ў час карнай нямецкай аперацыі ў Белавежскай пушчы. За тыдзень да наступлення Чырвонай арміі і правядзення аперацыі "Баграціён" брыгада прыняла ўдзел у рэльсавай вайне і знішчыла 878 метраў чыгуначнага палатна.

Адным з народных мсціўцаў быў Васіль Фёдаравіч Палятаеў. У 1940 г. яго прызвалі на службу ў Чырвоную армію. Давялося служыць у Беларусі. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ён стаў удзельнікам баявых дзеянняў супраць фашысцкай Германіі. З ліпеня 1942 г. удзельнічаў у партызанскім руху, камандаваў аддзяленнем падрыўнікоў у атрадзе імя С.М.Кірава брыгады Панамарэнкі.

**З успамінаў начальніка штаба атрада імя С.М.Кірава Канстанціна Іванавіча Кузняцова:**

"Група партызан, у якой быў і В.Палятаеў, пры выкананні баявога задання была акружана і схоплена немцамі. Ад сувязных мне стала вядома, што пры ўмове выдаць атрад фашысты гарантавалі ім жыццё, але тыя нікога не выдалі. Акупанты доўга білі нашых таварышаў. Не вытрымаўшы катавання, загінуў В.Палятаеў." Адна з вуліц Поразава носіць яго імя.

**З журнала баявых данясенняў 44-ай гвардзейскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі** (камандзір дывізіі – гвардыі генерал-маёр Барысаў): "Падраздзяленні 128-га гвардзейскага Чырвонасцяжнага стралковага палка, знішчыўшы асобныя групы праціўніка ў лесе на ўсход ад Новага Двара, працягвалі наступленне і да 17 гадзін выйшлі на паўночна-заходні ўзлесак на ўсход ад Новага Двара. Прыкрыўшыся адным стралковым батальёнам у напрамку адзнакі 187,7 – 175,5, другім стралковым батальёнам пачаў абход Новага Двара з паўночнага ўсходу, перарэзаўшы бальшак Поразава – Новы Двор.

Бой за Поразава, якое праціўнікам было ператворана ў моцны апорны пункт, цягнуўся некалькі гадзін. Але нішто не магло прыпыніць наступленне нашых байцоў.

У вызваленні Поразава ва ўзаемадзеянні з 37-ай гвардзейскай дывізіяй удзельнічала 170 Рэчыцкая Чырвонасцяжная ордэна Суворава II ступені стралковая дывізія пад камандаваннем Цыплянкова Сямёна Рыгоравіча.

**З успамінаў С.Р.Цыплянкова:** "…Раніцай 15 ліпеня перадавыя батальёны 422-га і 391-га палкоў падышлі да ракі Рось. Батальёну 422-га палка параўнаўча лёгка ўдалося фарсіраваць раку і авалодаць вёскай Гарнастаевічы. Цяжэй была справа на ўчастку 391-га палка. Праціўнік з заходняга берага, з сяла Поразава, вёў моцны мінамётны і кулямётны агонь. Каб пазбегнуць лішніх страт, камандзір батальёна капітан Ф.Н.Гардзееў (ён толькі прыбыў са шпіталю), разгрупаваў

батальён і пад прыкрыццем агню 3-га дывізіёна 294-га артпалка на шырокім участку пачаў фарсіраваць раку. Першай пераправіліся на другі бераг 2-ая стралковая рота”.

**З ўспамінаў былога камандзіра маёра запасу Ф.Н.Гардзеева:** “Рота старшага лейтэнанта С.М.Карнілава ўздоўж усходняга берага здзейсніла трохкіламетровы марш, бесперашкодна фарсіравала раку, затым уварвалася на ўскраіну Поразава, дзе завязаўся бой. Праціўнік усе свае асноўныя сілы накіраваў супраць 2-ой роты. А ў гэты час фарсіравалі раку іншыя роты батальёна”.

15 ліпеня 1944 г. у ходзе Беластоцкай аперацыі Поразаўскі край быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта наступальная аперацыя войск 2-га Беларускага фронту (камандуючы генерал-палкоўнік Г.Ф.Захараў) – састаўная частка аперацыі “Баграціён” 1944 г. У ёй удзельнічалі арміі: 3-я (перададзена са складу 1-га Беларускага фронта, генерал-палкоўнік А.В.Гарбатаў), 49-я (генерал-лейтэнант І.Ц.Грышын), 50-я (генерал-лейтэнант І.В.Болдзін), 4-я паветраная (генерал-палкоўнік авіяцыі К.А.Вяршынін), а таксама 65-ая і 48-ая арміі 1-га Беларускага фронта.

Многа салдат і афіцэраў былі адзначаны ўзнагародамі за вызваленне Поразава. Наводчык гарматы 40-га знішчальнага дывізіёна сяржант Н.І. Рыбакоў, пераправіўшыся на заходні бераг, у час вулічных баёў падбіў самаходку праціўніка, а другую падпаліў. Гэта значна аслабіла супраціўленне немцаў. Да ордэна Славы ІІІ ступені, якім сяржант Рыбакоў быў узнагароджаны за бой пры фарсіраванні ракі Друць, дабавіўся ордэн Чырвонай Зоркі.

Кулямётчык Б.Джураеў у час вулічных баёў быў паранены, але не пайшоў з поля бою, сказаўшы санітару, які хацеў адправіць яго ў санчасць: “Пакуль не вызвалім сяло, нікуды не пайду”.

Ордэнам Славы ІІІ ступені былі ўзнагароджаны старшы сяржант І.С.Панарын, кулямётчык Б.Джураеў, радавыя Н.А.Сілкін, М.К.Няроўскі.

Вялікую дапамогу батальёну ў разгроме праціўніка ў Поразава аказвала 7-ая батарэя 294-га артпалка старшага лейтэнанта М.А.Астрогі. Агнём гэтай батарэі было знішчана некалькі агнявых кропак праціўніка і мінамётная батарэя. За гэты бой старшы лейтэнант М.А.Астрога быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені. Такім жа ордэнам быў узнагароджаны і камандзір батальёна Ф.Н.Гардзееў.

**З баявых данясенняў і аператыўных зводак 170-ай стралковай дывізіі:**

15.07.1944 г.

“Часці дывізіі вялі ўпартыя баі на рубяжах Панасоўшчына, Амшары і ў 6.00 15.7.1944 г. выйшлі і вядуць бязлітасны бой за пераправу на заходнім беразе р.Рось, 422-ы стралковы полк вядзе бой на ўчастку Кабузі – Гарнастаевічы. 391-ы стралковы полк – Гарнастаевічы – Кавалі, адной стралковай ротай фарсіраваў р. Рось і вядзе бой у лесе за 500 м на захад ад в. Кавалі. 717-ы стралковы полк – Кусянцы – Поразава ва ўзаемадзеянні з левым суседам, авалодаў мястэчкам Поразава, працягвае наступаць у паўночна-заходнім напрамку.

У 10.50 пасля 10-мінутнага артналёту часці перайшлі ў імклівую атаку праз Рось, але з-за масіраванага артылерыйскага і мінамётнага агню праціўніка поспеху не мелі, залеглі непадалёку ў гатоўнасці да паўторнай атакі.

170-ая стралковая дывізія за суткі авалодала населенымі пунктамі… Грынявічы, Кабузі, Гарнастаевічы, Кавалі, Кусянцы, Поразава ва ўзаемадзеянні з левым суседам.”

**З аператыўнай зводкі начальніка 42-га стралковага корпуса:**

“…Страты за суткі: паранены 71 чалавек, забіты 13 чалавек. Ранены падпалкоўнік Бялецкі, забіты начальнік штаба 294-га артылерыйскага палка маёр Зімін і начальнік артылерыі 42-га стралковага палка маёр Плотнікаў. Праціўніка знішчана каля 150 салдат.”

Адразу пасля вызвалення Поразава адноўлена дзейнасць органаў савецкай улады, партыйных і камсамольскіх арганізацый.

З 20 верасня 1944 г. Поразава – цэнтр раёна Гродзенскай вобласці.

У 1947 г. у раённым цэнтры дзейнічае няпоўная сярэдняя школа, МТС, раённая бальніца (у Багудзенках).

У 1950 г. арганізаваны калгас імя Свярдлова, які першапачаткова аб’ядноўваў 250 гаспадарак (старшыня А.Ярашэвіч).

У 1951 г. да калгаса імя Свярдлова быў далучаны калгас “Перамога” (в.Заполічы).

З 30 красавіка 1958 г. Поразава – гарадскі пасёлак, цэнтр Поразаўскага пасялковага Савета, цэнтр саўгаса “Поразаўскі” (увайшлі ўзбуйненыя калгасы імя Малянкова, імя Свярдлова, “Запаветы Леніна” з вёскамі Дзешкаўцы-Груд, Дзешкаўцы-Старыя, Целякі, Хрустава, Маташы, Заполічы, Навасады).




З 20 студзеня 1960 г. Поразава знаходзіцца ў складзе Свіслацкага раёна. У 1970 г. у Поразава было 2049 жыхароў, у 2002 г. – 1,3 тыс. жыхароў.

У 2004 годзе ў склад УСП “Саўгас “Поразаўскі” увайшло ўнітарнае сельскагаспадарчае прадпрыемства “Саўгас “Гарнастаевічы”, а у 2005 годзе далучыўся і сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў “Сакольнікі”.



У 2012 г. на ўскраіне Поразава пабудавана аўтазаправачная станцыя з прыдарожным сэрвісам.

У 2013 г. у Поразава пражывала 1166 жыхароў.

З 1 студзеня 2014 г. Поразава – цэнтр сельсавета.

На 2023 г. у Поразава налічвалася 413 гаспадарак, 925 жыхароў. Да паслуг жыхароў вытворчы ўчастак “Свіслацкая фабрыка лазовай мэблі ААТ “Гроднапрамбуд”, вытворчы ўчастак СПК імя Дзеньшчыкова, Поразаўскі ўчастак ЖКГ, Поразаўскі ўчастак Свіслацкага раёна электрычных сетак, сярэдняя школа, філіял “Свіслацкай дзіцячай школы мастацтваў”, сектар культуры і вольнага часу, бібліятэка-цэнтр краязнаўства, амбулаторыя ўрача агульнай практыкі, пункт хуткай дапамогі, аптэка, філіял Беларусбанка, аддзяленне сувязі, 3 магазіны, 2 лясніцтвы.

